молодежная, детская печать. Выходили газеты и журналы для национальных меньшинств (польские и еврейские). Вокруг периодической печати объединялось 8865 внештатных корреспондентов, в том числе 1385 рабкоров, 3482 селькора, 350 деткоров, 3445 вузовских, военных и прочих корреспондентов.

Партия и Советская власть взяли под защиту корреспондентов от преследований со стороны бюрократов, зажимщиков критики, кулацких и нэпманских элементов. Органами суда и прокуратуры был издан целый ряд правовых документов на этот счет, проведен ряд показательных судебных процессов в центре республики и на местах с целью предоставления печати возможности выполнять функцию орудия советской демократии.

УДК 947.6 «1917»

М. Я. Сяменчык, дацэнт

## СЯЛЯНСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

The article dwells upon the process of the rise and activities of peasant organizations in Belarus after the victory of February revolution.

Пачатак 1917 года не выяўляў прыкмет наспявання рэвалюцыі ў Расійскай імперыі, асабліва на яе ўскраінах. Так, у беларускіх губернях, ва ўмовах вайны ператвораных у суцэльную франтавую зону, існаваў жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым, які пазбаўляў мясцовае насельніцтва адкрыта змагацца не толькі за свае палітычныя, але і эканамічныя інтарэсы. Адпаведным чынам гэта адбілася на аграрным руху чатырохмільённага сялянства.

Той лакальны сацыяльны выбух, які адбыўся ў Петраградзе 25—27 лютага 1917 г., забяспечыў перамогу рэвалюцыі на карысць усяго грамадства краіны і даў магчымасць дэмакратычнага вырашэння яго наспелых праблем. Важнай передумовай таму стала абвяшчэнне і неадкладнае ажыццяўленне ўрада вай Дэкларацыі ад 2 сакавіка аб ліквідацыі найбольш адыёзных інстытутаў самаўладдзя (бюракратычная адміністрацыя, паліцыя, корпус жандараў) і аб наданні грамадзянам краіны дэмакратычных правоў і свабод.

На Беларусі звесткі аб рэвалюцыі выклікалі тую ж рэакцыю, што і паўсюдна ў краіне, з тым толькі адрозненнем, што іх распаўсюджванне адбывалася крыху пазней і пад кантролем вышэйшага ваеннага камандавання.

У ліку першых грамадска-палітычных акцый варта адзначыць не толькі ўтварэнне камітэтаў бяспекі, Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, органаў Часовага ўрада, але і актыўнае абвяшчэнне аб падзеях вясковых жыхароў, якое праводзілася ўсімі ўладнымі і грамадскімі структурамі, асобнымі групамі інтэлігентаў і служачых і г. д. Аднак, у адрозненне ад гарадскога і часткова мястэчковага насельніцтва, сялянства не выказвала ніякіх імкненняў да арганізацыі. Абвяшчэнне на валасных сходах апошніх царскіх маніфестаў і звестак аб стварэнні новага ўрада не выяўляла таксама прыкметных змен у яго настроях і паводзінах. Тым не менш ва ўладных і грамадскіх колах існавала меркаванне, што пры пэўных умовах сяляне маглі выявіць актыўнасць, несумяшчальную з урадавай праграмай і лозунгамі рэвалюцыі. Так, на пачатку сакавіка ў шэрагу месцаў адбыліся захопы памешчыцкага дабра, парубкі лесу і г. д. Таму важнейшымі мэтамі растлумачальнай працы на вёсцы з'ўлялася прадухіленне жыхароў ад захопаў дзяр-

жаўнай і прыватнай маёмасці, укараненне ў свядомасць пераканання аб абавязковым вырашэнні іх патрэб Устаноўчым сходам, забеспячэнне харчовых паставак на патрэбы горада і фронту.

Пэўныя станоўчыя перспектывы для стабілізацыі аграрнага руху ў краіне, у тым ліку на Беларусі, узніклі ў сувязі з аднаўленнем дзейнасці Усерасійскага Сялянскага саюза, які станоўча сябе зарэкамендаваў яшчэ ў часы першай рускай рэвалюцыі. У новых умовах менавіта ён пачаў дзейнічаць як прафесійна-палітычная арганізацыя ў мэтах згуртавання сялянства і падрыхтоўкі яго да выбараў ва Устаноўчы сход. «Галоўны камітэт Усерасійскага Сялянскага саюза заклікае сялянства падтрымаць Новы Урад, яго камісараў і ўсе грамадскія арганізацыі,— гаварылася ў адозве ад 15 сакавіка,— якія прызнаюцца Часовым урадам, а ні ў якім разе не дапускаючы самаўпраўства і замахаў на чужую ўласнасць і свабоду...Зямельнае пытанне ва ўсёй паўнаце можа вырашыць толькі адзін Устаноўчы сход, гэта значыць, Увесь Народ Зямлі Рускай...» [1].

У ліку першых на Беларусі камітэт Сялянскага саюза быў утвораны ў сярэдзіне сакавіка ў Гомелі, на з'ездзе 700 дэлегатаў павета. Прыкладна ў той жа час адпаведную працу распачаў Мінскі Савет і іншыя грамадскія арганізацыі горада, што на практыцы ўвасобілася 22—23 сакавіка ва ўтварэнні камітэта Сялянскага саюза і губернскага сялянскага камітэта [2]. У гэтай сувязі варта адзначыць, што іх ініцыятары ставілі на мэце не столькі развіццё сялянскага руху, колькі ўсталяванне над ім кантролю ў адпаведнасці з агульнадэмакратычнымі і дзяржаўнымі інтарэсамі.

Дзеячы мінскіх Беларускага і партыйнага (БСГ) камітэтаў з моманту афармлення сваіх арганізацый таксама распачалі актыўную працу ў галіне згуртавання сялянства, але з цягам часу сустрэлі сур'ёзнае процідзеянне з боку мясцовых прадстаўнікоў «рэвалюцыйнай дэмакратыі» М.В. Фрунзе, С.П. Каваліка і інш.Так, кіраўнікі зноў створанага Мінскага губернскага сялянскага камітэта ігнаравалі скліканы на 4 красавіка Краёвы сялянскі з'езд (старшыня прэзідыума А. Смоліч). У далейшым, па меры стварэння партыйных (сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў, народных сацыялістаў), савецкіх і іншых арганізацый іх лідэры прыкладалі максімум намаганняў з тым, каб ізаляваць прадстаўнікоў Беларускага Нацыянальнага Камітэта і БСГ ад сялянства.

У красавіку Мінскі камітэт Сялянскага саюза зрабіўся найбольш уплывовай губернскай арганізацыяй. Яго прадстаўнікі з'яўляліся членамі губернскага камісарыята, харчовых камітэтаў усіх узроўняў, а таксама Франтавога камітэта. 20—23 красавіка адбыўся сялянскі з'езд Мінскай і Віленскай губерняў у складзе каля 800 чал. Пад уздзеяннем старшыні М.В. Фрунзе ён прыняў пастановы, якія ў агульнапалітычнай частцы дубліравалі рэзалюцыі Франтавога з'езда, а па нацыянальным пытанні выказаўся супраць аўтаноміі краю і беларускай школы. Акрамя таго, дэлегаты вырашылі стварыць «адзіную моцную сялянскую арганізацыю — Савет сялянскіх дэпутатаў, які павінен дзейнічаць заадно з Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў». Створаны з гэтай нагоды выканаўчы камітэт узяў на сябе абавязак апублікаваць прынятыя пастановы, асобна звярнуўшыся з заклікам «не прыступацца да вырашэння зямельнага пытання да рашэння Устаноўчага сходу, перасцерагаючы ад гвалтаў і захопаў, якія губяць справу рэвалюцыі» [3].

Адным з важнейшых наступстваў названага форуму было скліканне павятовых з'ездаў сялянскіх дэпутатаў, дзе, акрамя іншага, ішла шырокая агітацыя за стварэнне суполак Сялянскага саюза. Як вынікае з пастановы Мазырскага з'езда, на яго (саюз) ускладалася распаўсюджванне «газет і кніжак у народзе», пасылка на вёску агітатараў,

кантроль над камісарыятам, пасрэдніцтва паміж сялянствам і іншымі грамадскімі арганізацыямі.

Сялянскі з'езд Ігуменскага павета, які пачаў працу 7 мая, таксама надаваў важную ўвагу Сялянскаму саюзу. Значнай актыўнасцю вызначалася суполка ў Рэчыцкім павеце. У той самы час у астатніх паветах губерні дзейнасць саюза была амаль непрыкметнай, а стварэнне Саветаў адбылося не раней за лета.

У Віцебскай губерні ўзнікненне першых суполак сялянскага саюза адбылося ў красавіку—маі ў Гарадоцкім, Дрысенскім, Віцебскім паветах. Каардынуючую ролю адыгрываў губернскі Арганізацыйны камітэт саюза (старшыня У.М. Карпаў) [4]. Як вынікае з пастановы Каменскай валаснох арганізацыі (Дрысенскі павет) ад 21 красавіка, яе выканкому належала займацца выпіскай літаратуры; склікаць сходы і мітынгі, арганізоўваць лекцыі. Было вырашана таксама адкрыць сялянскі клуб, а на патрэбы «асветы і канцылярыі» зрабіць членскія ўзносы (50 кап.) і грамадскія ахвяраванні [5]. У шэрагу вёсак губерні былі створаны сельскія камітэты саюза, накшталт Палоўніцкага, Жарэбцкай валасці. З астатніх губерняў найбольш актыўна арганізацыя суполак Сялянскага саюза адбывалася ў Рагачоўскім павеце.

Другой буйнейшай формай аб'яднанняў вясковых працоўных з'яўляліся Саветы сялянскіх дэпутатаў, першыя з якіх узніклі ў Мінску, Магілёве, Гомелі, Горках, Мсціславе, Полацку, м. Гарадзея Навагрудскага павета і інш.

Сялянскія Саветы на Магілёўшчыне і, асабліва, у Гомелі і Оршы ўзніклі пасля заснавання губернскага выканкома пры актыўным удзеле Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Моцны ўплыў на далейшы лёс суполак Сялянскага саюза рабілі вынікі Усерасійскага з'езда сялянскіх дэпутатаў і дзейнасць яго Выканаўчага камітэта. У прыватнасці, у Віцебскай губерні пад уздзеяннем іх пастаноў у чэрвені пачалася рэарганізацыя камітэтаў Сялянскага саюза ў Саветы сялянскіх дэпутатаў як органаў, здольных «адстойваць інтарэсы працоўнага народа па здабыванні зямлі і волі» [6]. 23 чэрвеня на пасяджэнні губернскага выканкома было рэкамендавана неадкладна прыступіцца да стварэння ў вёсках, каля вучылішч, прыходаў і г. д. «маленькіх ячэяк сялянскіх Саветаў з тым, каб сяляне маглі збірацца і слухаць чытанне газет і брашур, талкаваць аб справах і выносіць рашэнні, якія датычаць іх раёну» [7]. Але некаторыя з ранейшых суполак Сялянскага саюза працягвалі сваё існаванне нават пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Асноўная маса суполак саюза злілася з Саветамі, асабліва пасля таго, як паміж дзвюма гэтымі арганізацыямі адбыўся канфлікт на ўзроўні ўсерасійскіх выканкомаў. Невыпадкова, што на II з'ездзе сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў (30 ліпеня—2 жніўня) выявілася рэзка адмоўнае стаўленне да Сялянскага саюза, маўляў, «ёсць у нас Саветы сялянскіх дэпутатаў, а ўтварэнне Сялянскага саюза толькі ўносіць дэзарганізацыю ў нашы шэрагі».

З іншых сялянскіх арганізацый вядомы Рэвалюцыйныя камітэты, якія некаторы час дзейнічалі ў Гомельскім і Рэчыцкім паветах, але ў іншых рэгіёнах распаўсюджвання не атрымалі.

Нельга не адзначыць і той акалічнасці, што, нягледзячы на намаганні пэўных палітычных сіл, на Беларусі так і не адбылося ўтварэння ніводнага згуртавання батракоў. Магчыма, што іх прадстаўнікі меліся ў сялянскіх арганізацыях, але можна меркаваць, што актыўнай ролі яны там не адыгрывалі.

Усяго з красавіка па кастрычнік на Беларусі дзейнічалі 4 губернскія, 25 павятовых, не менш за 17 валасных Саветаў сялянскіх дэпутатаў. За гэты ж час адбыліся 3 гу-

бернскія з’езды ў Магілёве, па 2 — у Мінску, Віцебску, Дзісне. У вырашэнні сваіх задач яны (за выключэннем Мінскіх, губернскага і павятовага) цесна супрацоўнічалі з Саветамі рабочых і сялянскіх дэпутатаў, мелі ўласныя (Мінск, Віцебск, Дзісна) і сумесныя (Магілёў, Гомель, Рагачоў, Мазыр) органы друку.

Сялянскія Саветы былі прадстаўлены ў зямельных і харчовых камітэтах усіх узроўняў, уваходзілі ў губернскія і павятовыя органы ўлады. Усе разам яны прыкладалі намаганні, каб прадухіліць стыхійны і інспіраваны бальшавікамі захопны рух, утрымаць сялянства ў рэчышчы агульнай барацьбы за ўмацаванне новага ладу. У параўнанні з суполкамі Сялянскага саюза Саветы былі больш палітызаванымі.

Гаворачы пра сялянскія арганізацыі, нельга пакідаць па-за ўвагай тую акалічнасць, што рэвалюцыя захапіла вёску на тым этапе, калі яна заставалася на параўнальна нізкім адукацыйным узроўні. Нягледзячы на распачатую актыўную дзейнасць у накірунку асветніцкай працы на вёсцы, прагрэс у гэтым сэнсе ледзь сябе выяўляў, аб чым, у прыватнасці, сведчыць слабы ўдзел сялян у земскіх выбарах, адсутнасць цікавасці да нацыянальнага жыцця, недавер да інтэлігенцыі, бытавы антысемітызм і інш. У адрозненне ад іншых пластоў насельніцтва, сялянства так і не здолела самаарганізавацца, а прыняло формы, прапанаваныя іншымі грамадска-палітычнымі аб’яднаннямі.

Аднак гэта зусім не значыць, быццам «Лютаўская рэвалюцыя не ўнесла нічога новага ў палітычныя правы сялян» [8]. Сяляне, як і астатнія пласты насельніцтва, набылі іх з першых дзён сакавіка. Іншая справа, што самастойна, без пасрэднікаў, скарыстаць іх у сваіх інтарэсах яно не жадала або не здолела. Натуральна, што сяляне траплялі ў стан заложнікаў да сваіх арганізатараў і былі вымушаны галасаваць за рэзалюцыі па пытаннях, у якіх мала разбіраліся. Часта многія дэлегаты сялянскіх з’ездаў пасля абмеркавання пытання аб зямлі збіраліся дадому. Адпаведным чынам і самі палітычныя партыі настолькі прываблівалі сялянства, наколькі прывабнай была іх аграрная праграма. Невыпадкова таму, што ва ўмовах малазямелля беларускіх губерняў найбольшую сімпатыю вясковых грамад («обществ») выклікала ідэя канфіскацыі памешчыцкага землеўладання з далейшым падзелам яго па спажывецка-працоўнай норме, а разам з ёй (ідэяй) — і сама Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Па сутнасці, сялянскія Саветы ў сваёй большасці зрабіліся своеасаблівымі эсэраўскімі аддзеламі, што яскрава ўвасобіліся ў сумесных спісах кандыдатаў ва Устаноўчы сход.

У цэлым, на працягу з красавіка па кастрычнік 1917 г. сялянства Беларусі, дзякуючы сваім арганізацыям, адгукнулася на заклік дзяржаўных і грамадска-палітычных структур аб падтрымцы Часовага ўрада, дапамозе фронту, барацьбе супраць дэзерцірства і г. д. Найважнейшай іх заслугай патрэбна лічыць таксама прадухіленне масавага захопнага руху, умацаванне аўтарытэту Устаноўчага сходу, стварэнне ўмоў для актыўнага ўдзелу працоўных вёскі ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадства.

ЛІТАРАТУРА

1. Вестник Минского губернского комиссариата.— 1917.— 19 марта.
2. Там жа.— 29 марта.
3. Новое Варшавское утро.— 1917.— 5 мая.
4. Известия Витебского Совета.— 1917.— 7 июня.
5. Там жа.— 20 мая.
6. Там жа.— 7 июня.
7. Там жа.— 28 июня.

8. Игнатенко И. М. Беднейшее крестьянство — союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии (1917—1918 гг.).— Мн.: Изд-во Министерства высшего, среднего специального и профессионального образования БССР, 1962.— С. 116.

УДК 947.6 «19»

П. В. Дзядзюля, дацэнт

## КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ГРАМАДСКІХ РУХАЎ І АБ'ЯДНАННЯЎ НА ПАЧАТКУ XX СТ.

The articl dwells upon the process of the rise and activities of peasant organizations in Belarus ofter the victory of February revolution.

Адмена прыгону паскорыла працэс развіцця капіталістычных адносін у Расійскай імперыі. Упоравень з іншымі развітымі рэгіёнамі Расіі ўцягваліся ў новыя гаспадарчыя сувязі і пяць губерняў Паўночна-Заходняга краю. Будаўніцтва чыгунак, шасейных дарог, добрыя рачныя камунікацыі, блізкасць Заходняй Еўропы стымулявалі тут развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі і садзейнічалі фарміраванню краёвага рынку. Адначасова расла патрэбнасць у кваліфікаваных рабочых, спецыялістах з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй.

Царскі ўрад, праводзячы на Беларусі палітыку русіфікацыі, не задаволіў просьбу мясцовых улад і груп інтэлігенцыі аб адкрыцці універсітэта ў адным з гарадоў краю. Але ён быў вымушаны пашыраць пачатковую адукацыю, для якой былі патрэбны настаўнікі. За перыяд з 1864 па 1909 г. у Заходне-Паўночным рэгіёне царскай імперыі пачынаюць дзейнасць Маладзечанская, Полацкая, Нясвіжская, Свіслацкая, Панявежская, Нова-Вілейская, Рагачоўская настаўніцкія семінарыі; Віленскі, Віцебскі, Магілёўскі, Мінскі настаўніцкія інстытуты. Выхадцы з Беларусі вучацца ва універсітэтах, інстытутах, акадэміях у Пецярбургу, Маскве, Тарту, Кіеве, Варшаве і іншых гарадах.

У беларускай нацыі не было выразніка яе інтарэсаў, а ў інтэлігенцыі, якая толькі што пачала выходзіць у свет,— свайго цэнтра. Інтэлігенты пачынаюць шукаць арганізацыйныя формы работы на карысць краю. Яшчэ маладасведчаныя ў тэорыі і практыцы грамадскай работы, яны вучацца ў суседзяў: украінцаў, палякаў, яўрэяў, літоўцаў, у якіх рост нацыянальнай самасвядомасці пачаўся раней і адбываўся больш інтэнсіўна. Варта адзначыць, што і пэўная частка рускай інтэлігенцыі спачувала беларусам у іх імкненні стварыць нацыянальныя арганізацыйныя структуры адраджэння.

На Беларусі па розных прычынах у канцы XIX і пачатку XX ст. апынулася значная колькасць адукаваных спецыялістаў з Расіі. Гэта былі не толькі чыноўнікі каланіяльнага па сутнасці дзяржаўнага апарату, шавіністы розных адценняў, але і людзі прагрэсіўных поглядаў, сапраўдныя асветнікі, што засвоілі дэмакратычныя традыцыі многіх пакаленняў змагароў супраць дэспатызму. Сярод іх былі настаўнікі, медыцынскія работнікі, аграномы, журналісты і інш.

Яшчэ 19 лістапада 1898 г. у Мінску па ініцыятыве вядомага рускага пісьменніка Я. М. Чырыкава, якога жыццёвыя хвалі закінулі на Беларусь, ствараецца «Таварыства аматараў прыгонных мастацтваў». Гэта была грамадская культурна-асветніцкая і літаратурна-мастацкая арганізацыя ліберальна-дэмакратычнага накірунку. Паводле статута, яна мела на мэце «служыць збліжэнню мясцовых дзеячаў у галіне мясцовых мастацтваў і асоб, якія спачуваюць ім, садзейнічаць развіццю і распаўсюджванню мастацтваў у Мінску» [I].